Як паведаміла прэс-служба Міністэрства абароны, дзве курсанткі будуць вучыцца па лётнай спецыяльнасці "Армейская авіяцыя" і пяць — па інжынерных спецыяльнасцях. Яшчэ тры дзяўчыны паступілі на факультэт сувязі і аўтаматызаваных сістэм кіравання.

Нагадаем, зараз у Ваеннай акадэміі па лётнай спецыяльнасці вучыцца толькі адна дзяўчына — Наталля Малашанка. 14 чэрвеня ў 206-й штурмавой авіябазе ў Лідзе яна ажыццявіла першы самастойны палёт на рэактыўным вучэбна-баявым Л-39 "Альбатрос".

Усяго па выніках уступнай кампаніі курсантамі Ваеннай акадэміі сталі 573 чалавекі. Самы высокі конкурс зафіксаваны на спецыяльнасцях "Ідэалагічная работа ва Узброеных сілах", "Кіраванне падраздзяленнямі сіл спецыяльных аперацый" і "Кіраванне мотастралковымі падраздзяленнямі".

Народная Воля
http://www.nv-online.info
27—29 ЛІПЕНЯ 2010 г.

ВАС ИНТЕРЕСУЕТ

Борис НЕМЦОВ: *«Два сапога — пара»*

В официальных белорусских газетах "Звязда" и "Рэспубліка" были опубликованы выдержки из доклада Бориса Немцова "Путин. Итоги. 10 лет". Понятно, что белорусские власти в информационной войне с Россией методов не выбираюп. Но интересно, что думает Борис Немцов по поводу того, что его стали цитировать официальные белорусские СМИ?

Ядвига Высоцкая, г.Минск.

Отвечает Борис Немцов.

— Ко мне по этому поводу обращаются как российские, так и белорусские журналисты: мол, неужели вы, господин Немцов, объединились с Лукашенко для борьбы с Путиным.

Отвечаю: никто из официальных лиц Беларуси за разрешением публиковать выдержки из нашего доклада не обращался. Впрочем, мы даже рады, что теперь не только российские, но и белорусские граждане узнают об истинных итогах правления Владимира Владимировича Путина.

Я считаю, что Лукашенко и Путин — близнецы-братья. Да, ненавидят друг друга сейчас, может быть, даже презирают, но сути это не меняет. Оба действуют авторитарными методами, оба затыкают рот собственному народу, оба превратили выборы в фарс, оба цепляются за власть из последних сил, оба используют спецслужбы и омоновские дубины для борьбы с оппозицией.

Сотрудничать с кем-нибудь из них ради борьбы с другим считаю и аморальным и глупым делом. Чем быстрее оба исчезнут с политической сцены России и Беларуси, тем лучше для российских и белорусских граждан.

СЛЫШАЛИ?

Гипермаркеты — городам-спутникам

В городах-спутниках будут создаваться такие же условия проживания, как и в Минске.

В частности, планируется строительство такой же инфраструктуры.

"Думаю, гипермаркеты в Логойске, Заславле и Дзержинске мы построим раньше, чем они станут полноценными городами-спутниками", — сообщил председатель Миноблисполкома **Борис Батура**.

По его мнению, создание городов-спутников — это правильное направление, поскольку столица приближается к своим пределам. В настоящее время утверждена программа развития городов-спутников, а активные работы в Логойске начнутся уже в следующем году.

Китайский трудовой десант

Особенность китайских инвестиций, которыми так гордятся белорусские власти, в том, что деньги выделяются под закупку китайских товаров и технологий с использованием китайской же рабочей силы. В Беларуси Китай своей традиции не изменил.

Как стало известно "Белорусским новостям", МВД Беларуси положительно решило вопрос о выдаче специальных разрешений на право занятия трудовой деятельностью 600 гражданам КНР. Впервые в истории Департамента по гражданству и миграции разрешение столь большим "оптом" дается иностранным рабочим.

Кстати, только в Минске с привлечением кредитов китайских банков планируется реализовать 21 проект общей стоимостью около 1,3 млрд долларов. По сообщению Комитета экономики Мингорисполкома, в сводный план-график включены инвестпроекты по развитию транспортной и социальной инфраструктуры города в связи с проведением в столице Беларуси чемпионата мира по хоккею 2014 года.

В их числе строительство завода индустриального домостроения, создание интеллектуальной транспортной системы безопасности, строительство транспортных развязок, 10 паркингов, автобусного парка на улице Семашко и трамвайной линии в Серебрянку. В жилом районе "Лебяжий" кроме квартала в китайском стиле планируется построить две школы (на 1020 мест каждая) и два детских сада (каждый на 190 детей). Также Мингорисполком планирует привлечь китайских инвесторов для строительства гостиницы "Пекин" и жилого квартала "Чайна-таун".

Так что мигрантам из Поднебесной будет где руки приложить, и, судя по всему, десантом в количестве 600 человек дело не ограничится.

«Белавтодор» предлагает вернуть дорожный фонд

О необходимости вернуться к практике формирования дорожного фонда заявил начальник управления содержания дорожной сети департамента "Белавтодор" Александр Головнев на пресс-конференции в Минске.

Дорожный фонд был ликвидирован в 2010 году в связи с оптимизацией взимания налогов и сборов, которые формировали фонд. В частности, закон о бюджете на текущий год предусматривает отмену налога на приобретение автотранспортных средств. По словам Головнева, фонд должен быть целевым, с четко прописанными источниками пополнения. В частности, для пополнения дорожного фонда представитель "Белавтодора" предлагает ввести акцизы на бензин. Начальник управления также предложил ввести налог на покупку автомобиля. "Введение этих мер позволит многое решить в плане финансирования содержания дорожной сети", — сказал Головнев.

Он сообщил, что уже разработано проектно-техническое обоснование введения платы за пользование республиканскими автодорогами. "Однако в этом и следующем годах вводить плату не планируется. Сначала необходимо завершить реконструкцию основных дорог", — пояснил Головнев. Он отметил, что взимание платы за проезд по магистрали М1 сейчас полностью окупает ее содержание и частично — ремонт.

ПРОИСШЕСТВИЕ

Подполковнику ГАИ инкриминируется наезд

Спустя почти год прокуратура все же возбудила уголовное дело в отношении заместителя начальника батальона ДПС ГАИ УВД Витебского облисполкома за совершенный наезд на пенсионера-велосипедиста.

В сентябре 2009 года замначальника батальона ДПС ГАИ УВД Витебского облисполкома ехал по областному городу на личной автомашине "Ауди". Около 21.00 при выезде на главную дорогу подполковник ДПС совершил наезд на 68-летнего пенсионера, который ехал на велосипеде по той самой главной дороге.

В результате ДТП пенсионер-велосипедист получил телесные повреждения и был доставлен на лечение в больницу.

Разбирательство по происшествию длилось почти год, пишет интернет-издание "Ежедневник". За это время было вынесено множество решений и еще больше написано жалоб. Кто-то в городе говорил, что подполковник ДПС невиновен, кто-то утверждал, что его пытаются всяческими путями отмазать. Так или иначе, но спустя 10 месяцев прокуратура наконец вынесла решение о возбуждении уголовного дела в отношении замначальника батальона ДПС области. Ему инкриминируется совершение преступления по ч.1 ст.317 УК РБ (нарушение правил дорожного движения или эксплуатации транспортных средств лицом, управляющим транспортным средством, повлекшее по неосторожности причинение менее тяжкого телесного повреждения). Ведется следствие.

СУСТРЭЧЫ

Дзівак,

да якога валам валяць людзі не толькі з Мінска, але і з Літвы, Польшчы, Расіі, Вялікабрытаніі...

Ад аэрапорта "Мінск-2" да сялібы Сяргея Гулянкова — калі напрамкі — вёрст пятнаццаць. Вёсачка Заброддзе, на водшыбе якой прытулілася "хароміна" нетутэйшага чалавека, хоць і блізка ад Смалявіч і аэрапорта, але ўсё адно ў глухім месцы. Мо таму, што пры лесе, сярод балот і пустак, якія тут шчыльненька туляцца да тупкіх берагоў рэчкі Ушы. Да Заброддзя не вядзе шасейка, сюды не дапірае аўтобус, і тут дажываюць свой век адны старыя. Словам, мядзведжы кут...

У неперспектыўную вёску не загоніш колам не тое што гарадскога чалавека, але і месціча — з Шыпянаў там ці з Алесіна. А тут раптам знайшоўся дзівак, ды не які-небудзь прыблуда-бомж, а спраўны мужчына, які наважыўся атабарыцца ў Заброддзі. Пакінуў сталіцу, купіў пляц зямлі, пачаў будавацца...

Сяргей не дужа ахвочы распавядаць пра асабістае. Абмежаваўся па-анкетнаму сцісла: карэнны мінчанін, базавая адукацыя юрыдычная, дзеці дарослыя. Тутэйшыя мясціны ўпадабаў з тае пары, як па размеркаванні трапіў у Смалявічы. Дзяржслужба не прынесла ні радасці, ні духоўнага натаўлення, ні шчасця. Душа імкнулася да нечага зусім іншага. У рэшце рэшт кінуў усё і рассупоніў ветразь свайго карабля: няхай вятрыска напоўніць яго сэнсам, надасць размеранай хадзе імклівасць, прынясе сапраўдную радасць быцця!

Прыкладна гэтак думалася Сяргею, калі пачынаў сваю прыватніцкую справу. Ужо не маладзён, але з душою летуценніка, ён выдатна разумеў: бярэцца за няпростую справу, перагортвае старонку жыцця. І наступны аркуш — крок у малазведанае. Падахвочвала хіба што вера ў свае сілы ды прага да перамен. *"Яшчэ мусіць тое,* — прызнаецца ён, *— што над усім дамінавала прыцягненне прыродай. — Тут усё люба: восеньскае шапаценне чароту ў затоцы; бязважкае кружэнне белых сняжынак, што сядаюць на стрэхі хат; ціхая вада ў рэчцы, якая — нібы маці дачцэ — расчэсвае зялёныя коскі водараслей... Прырода ва ўсіх праявах сваіх заўсёды кранала мяне да самага донца. А ў цяжкія моманты прыводзіла душу ў раўнавагу. Мо таму і шукаў любой зручнасці, абы пакінуць той ненавісны офіс і хутчэй апынуцца сам-на-сам з прыродай. Дзе-небудзь у глухамані, сярод дубраў, паплаваў, на азёрах, там, дзе меней людзей і дзе болей чысціні, цішыні і спакою. Гэта, паверце, не толькі мая прыхамаць. Усё больш гарадскіх людзей, затузаных стрэсамі, шукаюць паратунку пад крылом матухны-прыроды. То чаму не пайсці ім насустрач, не арганізаваць прытулак сярод такога хараства?.. А хараство, дзякаваць Богу, пакуль не прычэсана, не затаптана, не агаломшана цывілізацыяй, якая напірае адсюль. Вось так спакваля выношвалася ідэя стварыць агразакасядзібу. Для сябе і для людзей...*

Двухпавярховы дамок праектаваў сам. "Задумка была простая і ясная, — кажа Сяргей, — сядзіба павінна цалкам пасаваць да прыроднага асяроддзя, да мясцовага ландшафту. Дом толькі з натуральных матэрыялаў, цалкам драўляны. Ніякіх табе пластыкаў, электрычных камінаў і гіпсакартонаў! Чаму? Экалагічны складнік для мяне перадусім, бо прадыктаваны задумай жыць самому, гэтаксама як і тым, хто надумае тут правесці час у суладдзі з прыродай. І потым, мне даспадобы вясковы лад жыцця, дзе ўсё проста і натуральна. Вада з калодзежа, печ у хаце, лазня на дрывах...

— У цябе ўсё неяк наадварот: людзі імкнуцца да камфорту, да набыткаў цывілізацыі, а вы прапаноўваеце (каб жа толькі сабе!..) ледзь не спартанскі адпачынак... Ці не адаб'ецца такая супярэчнасць на даходнасці прадпрыемства? Бізнес жа павінен прыносіць ну хоць нейкі прыбытак...

— Распрацоўваючы свой праект шэсць гадоў таму, меўся паклапаціцца, канечне, і аб прыбытку. Але, па-першае, не было ў планах на экалагічным, турыстычным бізнесе выціснуць "доўгі рубель". Такое па-просту немагчыма, як бы ты ні стараўся. Асабліва ў нас, у Беларусі. Падругое, маё жыццёвае крэда, калі хочаце, жыццёвы прынцып: разумная дастатковасць ва ўсім. З цяжкасцю ўспрымаю людзей, у якіх па тры аўтамабілі, ці там яхты, і па дзесяць дамоў. Нерухомасць пустуе, а шыкоўныя лодкі месяцамі боўтаюцца ля прычальнай сценкі... Думаеце, такое толькі на "разбэшчаным" Захадзе? І ў нас досыць "паспяховых" людзей, якім багацце засціць усё. Не ўпэўнены, што цяперашнія нуворышы шчаслівейшыя за тых, хто, напрыклад, прыязджае на мой "хутар"... Кажу шчыра, бо мая "звышзадачка" простая як ровар: стварыць для сябе працоўнае месца, якое б прыносіла нейкі дастатак, нармальны, здаровы лад жыцця. Каб не панавала і блізка прыдуркаватых начальнікаў з іх незлічонымі цыркулярамі і ўказілаўкамі, каб на душы было спакойна і светла...

— Атрымалася?

— У немалой ступені так, атрымалася. Нават на этапе праектавання сялібы не пакідала ціхая радасць. А як будоўля была скончана, то праз інтэрнет, наша беларускае грамадскае аб'яднанне "Адпачынак у вёсцы" пачаў даваць абвесткі, рэкламаваць свой мядзведжы куток... Напачатку наведваліся паляўнічыя, рыбаловы. Ім тут раздолле, бо хапае і балот, і вадаёмаў, і лясных угоддзяў. А пасля пацягнуліся турысты, закаханыя парачкі, сем'і з дзецьмі, карпаратыўныя кампаніі... Прычым і зімою і ўлетку. Адны затрымліваліся на пару дзён-начэй, іншыя на тыдзень, два...

— Цікава, а як людзі бавяць час? У вас жа не толькі пасіўны, так бы мовіць, адпачынак, але і комплекс пэўных паслуг, скіраваных на турызм, рыбалку, спартыўныя гульні...

— Па-рознаму адпачывае народ. Для большасці самае галоўнае — прырода. Вы ж бачыце, якая прыгажосць. Нехта яшчэ да пеўняў на Ушы рыбачыць, ці там купаецца ў рачной прахалодзе, нехта ў лес па ягады, і таксама да сонца , а іншыя, бывае, спяць да паўдня. Санатарнага рэжыму тут няма і блізка.

Зразумела, ёсць у мяне і вуды, і лодкі, і канькі, і лыжы, і тэнісныя прычындалы, і розны іншы інвентар. Хочаш застолле на палянцы — ёсць шацёр; хочаш вячэру з шашлыкамі — мангалы і ўсё астатняе пад рукамі; жадаеш папарыцца ў лазні — не праблема, яна за дваццаць крокаў ад вады, між іншым... Многія ўзімку — як добра напарацца — то качаюцца ў снезе, альбо нават у палонку акунаюцца. Альбо на возеры — яно проста перад вокнамі дома — шайбу ганяюць. Гляджу на ўсё гэта і не нарадуюся, бо людзям добра, яны быццам тыя дзеці — адкрытыя, разняволеныя, вясёлыя. Ніякі лядовы палац гэтулькі здаровых эмоцый не падорыць, бо там сцены, гармідар, чэргі, а тут — белы снег, мароз, прастор і неба над галавой.

— Сяргей, адпачынак у вёсцы — цудоўная рэч для гараджаніна. А якія стасункі з месцічамі? Можа, пазіраюць як на дзівака ці як на "кулака"?..

— Ды не, адносіны прыязныя. Асабліва з суседзямі. Старыя людзі, старыя хаткі, вымірае вёска... На сорак двароў — дзве кароўкі, ды і тыя ў аднаго гаспадара. Але як трэба, то можна і малачка купіць, і смятанкі, а ў іншых яйкі, гародніну. Стараюся і я аддзячваць чым магу: некага ў раён падкіну, некаму лекі прывязу, дарогу параўняю, снег прыбяру. Ладзім, словам.

— А з якіх гарадоў прыязджаюць людзі ў твой мядзведжы кут?

— Не тое што з гарадоў — з розных краін дапіраюць. З Літвы, з Польшчы, з Расіі. А мінулай зімой прыехалі два хлопцы з Вялікабрытаніі. Папраўдзе, я быў моцна здзіўлены. Хаця, калі ўдумацца, інтэрнет жа сёння паверх усіх межаў. Дык вось, думаю сабе, і што яны тут упадабалі? Ці мо ад няма чаго рабіць, то і валэндаюцца па свеце. Аказалася не, прыстойныя маладыя людзі, адукаваныя, выхаваныя. Проста, як высветлілася, любяць падарожнічаць, але не па працярэбленых турыстычных сцежках, а па малавядомых, дзе еўрапейцы бываюць зрэдзь. Да таго ж яны літаральна памешаны на ўсходнеславянскай культуры і гісторыі. А наша прырода іх прывяла ў невыказнае захапленне, усё ім тут было міла. Аматары разумнага экстрыму, тым не менш да глыбіні душы былі ўзрушаны тым, як жывуць нашы старыя, пенсіянеры. Аднойчы, зусім выпадкова, прыйшлося Сціву і Дэну наведаць у суседнім двары надворны туалет. Канечне, былі ў шоку: спачатку доўга рагаталі, потым выпытвалі, ці паўсюль на вёсцы так. Прыйшлося чытаць цэлую лекцыю пра нашы традыцыі, неразвітасць каналізацыйнай сістэмы, аддаленасць мясцовасці ад горада. Мяркуючы па рэакцыі, "лекцыя" падалася ім малазразумелай, а довады непераканаўчымі, бо пры ўпамінанні слова "туалет" на іхніх тварах зноў і зноў з'яўлялася ўсмешка...

Ну а калі сур'ёзна, то многіх еўрапейцаў, асабліва з ліку тых, што не выносяць гарачыні, курортнага тлуму, наш край прываблівае ўсё больш і больш. Чаму? Не толькі таму, што адпачынак танны. Галоўная фішка — беларуская прырода, асабліва на перыферыі. Малакранутая чалавекам, месцамі першародная, багатая і даступная, тая, да якой мы прызвычаіліся і якую часам зусім не цэнім. Тыя ж Сціў і Дэн былі агаломшаны, калі побач з жытлом, за якія дзвесце крокаў, сустрэлі ў затоцы бабрыную сям'ю, а пасля напаткалі выдру, у суседняй дубраве сутыкнуліся з цэлым вывадкам дзікіх вепрукоў. Нездарма запэўнівалі — вернуцца сюды абавязкова...

Шчыра кажучы, і мне здалося ўсё тут мілым і прыгожым: сяліба, альтанка, возера, рэчка... Але бадай найбольшае ўражанне ад гаспадара сялібы, чалавека, які знайшоў у мядзведжым куце тое, да чаго імкнуўся — душэўную гармонію, цішыню, ласку прыроды. Ён хоць і ўладар гэтай мясціны, але не ўласнік, бо хіба можна завалодаць тым, што належыць усім?..

Георгій ЧЫГІР.
Фота аўтара.

Сёння Алег Сурган выходзіць на свабоду

Грамадскі актывіст з Віцебска Алег Сурган павінен быць вызвалены сёння, 27 ліпеня, з калоніі ў горадзе Глыбокае.

Нагадаем, што працэс над Алегам Сурганам меў вельмі гучны рэзананс. 19 лютага 2010 году суддзя Кастрычніцкага суда Віцебска **Яўген Буруноў** асудзіў яго на 6 месяцаў турмы і абавязаў выплаціць 2,5 мільёна беларускіх рублёў на карысць міліцыянера **Сяргея Дудкевіча**. Але справа выклікала абурэнне праваабаронцаў тым, што "пацярпелы" выглядаў здаровым і задаволеным жыццём, а вось на Алегу Сургану пасля інцыдэнту не было жывога месца.

3 верасня 2009 года Алега Сургана і яго малодшага брата **Тараса** міліцыянеры затрымалі на прыпынку грамадскага транспарту каля Медыцынскага універсітэта, дзе быў вывешаны бел-чырвона-белы сцяг. У Кастрычніцкім РАУС на Алега склалі пратакол аб тым, што ён супраціўляўся міліцыянерам, а аднаго з іх, лейтэнанта Сяргея Дудкевіча, нібыта ўкусіў за палец. Але сам Сурган распавёў, што першапачаткова складзены пратакол аб вывешванні бел-чырвона-белага сцяга некуды знік. Алег Сурган сцвярджае, што ў паставрунку міліцыянеры яго збівалі і катавалі. Тарас Сурган выклікаў брату "хуткую дапамогу", калі ўбачыў ягоны стан. Медыкі зафіксавалі ўшыбы галавы і рук, але як ні ў чым не бывала міліцыянеры распавялі, што Сурган сам біўся галовай аб машыну...

Дзікая гісторыя. Дзякуй Богу, што скончылася.

Ахвяра жатвы

У Пружанскім раёне смяротна траўміраваны электратокам 51-гадовы механізатар аднаго з мясцовых сельгаспрадпрыемстваў, жыхар вёскі Вялікае Сяло.

Як паведамілі БелаПАН у пракуратуры Пружанскага раёна, няшчасны выпадак адбыўся 23 ліпеня каля 17.00 на полі побач з вёскай Лазоўка. Загінуўшы, кіруючы зерняўборачным камбайнам "Палессе" і рухаючыся заднім ходам, збіў апору лініі электрапередач. У выніку адбыўся абрыў электраправадоў: два з іх упалі на кабіну камбайна, трэці -- на поле, дзе загарэлася жыта. Камбайнер са сваім памочнікам справіліся з агнём пры дапамозе вогнетушыцеля. Затым механізатар падышоў да камбайна, дакрануўся да яго рукой і быў траўміраваны электратокам. Ён загінуў на месцы.

Праверку па факце гібелі камбайнера праводзіць пракуратура Пружанскага раёна.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
27—29 ЛІПЕНЯ 2010 г.

Гэта не поспехі, гэта сорам

У газеце ідзе дыскусія "Ці трэба А.Лукашэнку вылучацца кандыдатам у прэзідэнты Рэспублікі Беларусь на чарговы тэрмін?". Я таксама кажу "Не!" і хачу дапоўніць спіс грунтоўных недахопаў яго кіраўніцтва за мінулыя 16 гадоў.

1. Усяляк замоўчваецца трагедыя беларускага народа ў час рэпрэсій 1929—1953 гадоў. Вядома, што за гэты час у Беларусі пацярпела ад 600.000 чалавек (па афіцыйных даных) да 1.000.000 (па неафіцыйных). Ахвяры былі амаль ва ўсіх існуючых зараз гарадах і вёсках, а таксама ў многіх сотнях зараз не існуючых вёсках і хутарах. Сіламі грамадскасці ва ўсёй краіне ў памяць ахвяр пастаўлена каля 30 сціплых помнікаў. Вяршыняй адносін А.Лукашэнкі да гэтага перыяду была фактычная спроба ў недалёкім мінулым знішчэння Курапатаў (пашырэнне праз іх Мінскай кальцавой дарогі).

2. Знявага Нацыянальнай Беларускай Мовы. Узровень выцісканння яе з ужытку ў самастойнай Беларусі стаў вышэйшым, чым быў у СССР. Напрыклад, толькі беларускамоўнае школьніцтва за час незалежнасці рэспублікі скарацілася больш чым удвая і зараз не дасягае 20 працэнтаў ад агульнай колькасці навучэнцаў. Безумоўна, гэта робіцца на падставе агульнавядомых уяўленняў А.Лукашэнкі пра нашу нацыянальную дзяржаўную мову. Як вынік, па даных ЮНЕСКА, беларуская мова ўключана ў лік знікаючых у свеце.

Дасягнуты ўзровень асіміляцыі нацыі паставіў краіну на балансаванне на мяжы знікнення.

3. Няздольнасць збалансаваць эканоміку краіны для вырашэння жыллёвай праблемы.

Сусветны паказчык узроўню жыллёвага будаўніцтва — пабудова штогод 1 м^2 на кожнага жыхара краіны пры кошце 1 м^2 прыкладна 0,9 ад сярэдняга месячнага заробку. У Беларусі штогадовы ўвод жылля ўсімі варыянтамі не дасягае і паловы ад патрэб, а кошт 1 м^2 прыкладна ў 3 разы вышэйшы за сярэднямесячны заробак.

Гэта не поспехі, гэта сорам!

Станіслаў ЛІСОЎСКІ.

Мінск.

ДИСКУССИЯ

Принципы холопствующих

Прочитал в газете "Народная Воля" за 16 июля 2010 года статью кандидата философских наук, председателя Белорусской социал-демократической партии (Грамада) Анатолия Левковича "Бодаться или искать консенсус?". Прочитал и напечатанную в том же номере просьбу редакции к читателям, чтобы они высказали свое мнение о поднятых проблемах. Вот и решил высказаться.

Я не любитель тех политических статей, в названиях которых ставятся вопросительные знаки. Потому что почти все они оказываются хитрыми, трусливыми, лживыми. Левкович поставил вопросительный знак. И дал ответ. Белорусские оппозиционеры и многие другие граждане должны не бодаться с высшими властями, а искать консенсус с ними. Латинский термин *consensus* означает полное согласие между разными группировками в вопросах важнейших, а не каких-либо пустяковых. Серьезные деятели не ищут никогда и нигде никакого консенсуса, а приходят к консенсусам. Идут в основном только разные хитрецы. В условиях Беларуси какая-либо партия, называющая себя оппозиционной, но весьма желающая иметь консенсус с высшими властями, — это в действительности не оппозиционная, а псевдооппозиционная партия. Даже лесные зайцы знают, что для них консенсусы с волками невозможны никогда. Получается, интеллект лесных зайцев более высок, чем интеллект некоторых оппозиционных лидеров.

А.Левкович цитирует несколько высказываний другого минского философа — доктора философских наук В.Оргиша и выражает свое несогласие с некоторыми его второстепенными мнениями. Но с главнейшими заявлениями Оргиша Левкович согласен. Одной из самых основных публикаций Оргиша является "Прыйшоў час сыходзіць з барыкад", напечатанная в газете "Советская Белоруссия". Автор открыто льет грязь почти на всю белорусскую оппозицию.

Оргиш и Левкович в своих статьях рассуждают о многих проблемах, однако всегда предпочитают не говорить ничего конкретного о самых основных, самых важных в Беларуси политических, экономических и философских вопросах: 1) Какая именно социально-экономическая система (формация) господствует теперь в Беларуси? 2) Почему почти ни один западноевропейский и американский государственный лидер не желает разговаривать о чем-нибудь значительном с нынешним президентом Беларуси? 3) Кто является в действительности главнейшим виновником большинства нынешних бед Беларуси?

В отличие от Оргиша и Левковича белорусский профсоюзный деятель А.Бухвостов и многие иные граждане заявляют, что нынешняя Беларусь — страна капиталистическая. А председатель белорусской политической партии "Справедливый мир" С.Калякин утверждает, что нынешняя социально-экономическая система в Беларуси — это не социализм, а обычный фашизм.

Убежден, самым главным виновником основных бед этой страны является большинство белорусского населения, которое холопствует перед высшими властями и боится выступать против явно неблагородной политики этих властей. Это большинство хихикает над истинными, героическими оппозиционерами и патриотами. Официальные пропагандисты заявляли и заявляют многократно, что белорусский народ — один из самых лучших народов земной планеты, но большинство этого лучшего народа плюет и на свой язык, и на свою историю.

Я — геолог. Я работал в Беларуси, в шахтах Донбасса, в Сибири, затем снова в Беларуси. На протяжении многих лет участвовал в поисках и открытиях великих залежей нефти и горючего газа в недрах Тюменской области. Эта нефть и этот газ являются сейчас основами экономики России и Беларуси. А моя пенсия сейчас за все эти труднейшие дела — 509.000 белорусских рублей в месяц. У меня теперь не хватает денег даже на покупку нового костюма. При таких обстоятельствах одобрять политику нынешней лукашенковской власти и соглашаться с рассуждениями В.Оргиша, А.Левковича и им подобных философов и общественных деятелей я не могу и не буду. Я участвовал и буду участвовать в мероприятиях оппозиционеров истинных, благородных. Эти мероприятия необходимы для моей Родины. И значительная польза Беларуси от них будет. Несомненно.

Сергей БОРИСОВ.

Минск.

Эх, если бы да кабы...

Уважаемая "Народная Воля"!

Ты предложила читателям высказываться по поводу публикации председателя Белорусской социал-демократической партии (Грамада), кандидата философских наук, доцента Анатолия Левковича под заголовком "Бодаться или искать консенсус?". Тема очень серьезная, и автор — серьезный человек, довольно известный политический деятель — рассуждает о том... Впрочем, то, о чем он долго рассуждает, облачая мысли в не слишком удобоваримую форму научных терминов, схем и словесно-стилистических конструкций, фактически сводится к элементарно-несбыточному: эх, если бы да кабы! Вот если бы белорусская оппозиция захотела стать, как говорят ученые, "системной", то есть договорилась о сотрудничестве с властью, то европейско-демократический рай в нашей стране был бы обеспечен. И всячески уговаривает, уговаривает эту несознательную оппозицию, вразумляет, что та не видит своего счастья, почему-то упрямится и не слышит умных призывов...

Не понимаю, о чем тут можно дискутировать. Впечатление, будто А.Левкович наблюдает за территорией, где размещается современная Беларусь, из далекой Галактики сквозь окуляр плохонького телескопа. И оттуда совсем не видно, как уже не раз представители нашей общественности, в том числе и оппозиции, шли на участие в "диалоге" с властью. Но, как и легко было предположить с самого начала, все кончалось, да и не могло окончиться иначе, как заурядным пшиком: разве способна авторитарная власть, в какие бы перья она ни рядилась, идти на заинтересованное, ради блага страны сотрудничество с демократическими силами, тем более что сами эти силы меж собой никак не найдут консенсуса? Да и чтобы, как видится автору, встроиться в существующую политическую систему, избегая крайностей — приспособленчества и открытого протеста (радикализма), то, как ни крути, "серединникам" — сторонникам, по ласковой формуле А.Левковича, "ориентации на устойчивое развитие" — придется идти на то же приспособленчество, в угодливое услужение власти на условиях последней. И такой трансформации им не избежать, если на вещи смотреть реально, а не витать, как некоторые деятели, высоко над землей...

Не знаю, о чем тут спорить. Просто в ответ на призыв А.Левковича к коллегам-оппозиционерам — умолять правителя о разрешении хотя бы подержаться за ручку двери во властных кабинетах, — спуститься на грешную землю и — строить программы, действовать, исходя из реального положения вещей и его возможного развития. А главное — не вздыхать о невозможном, а внятно и убедительно объяснить нам, простым людям, как с научно-политических высот выглядит будущее Беларуси. Вот за это буду очень благодарен.

С уважением —

Роман ЛЕСКОВ, житель Могилева.

Поговорим... С кем?

У меня только один вопрос к Анатолию Левковичу: кого он имеет в виду под понятием "...правящий класс"? Вообще-то создается впечатление, что и по Лукашенко, и по Левковичу правящий класс — это МВД, КГБ, ОМОН, Служба безопасности президента, "вертикаль" и отставники с большими звездами. А они ведь в упор не хотят видеть никакую оппозицию! Они с оппозицией консенсус искать не хотят и не будут. А для диалога, как известно, нужны две стороны.

М.Н.ГОРЕЛИК.

Минск.

ПРОБЛЕМА

Пенсионерам надо работать, а молодым — нет?

В настоящее время чиновники президентской команды работают в районах по выявлению проблем жителей Беларуси и помогают их разрешить. Работала комиссия и в нашем городе и районе. Но многие из недовольных работой районных чиновников все-таки не решились обратиться к проверяющим. Проверяющие приехали на пару дней и уехали, а нам дальше жить и работать, содержать свои семьи. Одна из таких необратившихся и я. А сейчас подумала: почему молчим?

Молодым специалистам, имеющим высшее образование, на хорошую работу у нас устроиться нет возможности: все хорошие места заняты пенсионерами. Проблематично и тем, кто имеет и образование, и опыт. Но продвинуться по служебной лестнице тоже очень трудно. "Специалисты"-пенсионеры работают много лет, боясь быть замененными, они становятся грубы, жестоки, беспощадны. Молодые их просто боятся: не дай Бог вступить в пререкания. Вылетишь как пробка. И у нас создалось такое мнение, что этих людей объединяют какие-то махинации, круговая порука.

Пенсионеры — люди, честно заслужившие своим тяжелым трудом покой. За него они получают пенсию. Это во-первых. А во-вторых: а куда деться молодым, которым еще надо растить детей, налаживать жизнь?

Анна Михайловна ШАФАЛОВИЧ.

г.Молодечно.

ПРЕДЛАГАЮ!

Улицу Быкова — в каждый город!

Активисты кампании "Говори правду!" под руководством знаменитого поэта, общественного деятеля, лауреата государственной премии Владимира Некляева начали исправлять пробел в истории Беларуси по отношению к одному из величайших сынов Беларуси — Василию Владимировичу Быкову, а именно: сбор подписей среди жителей столицы в поддержку того, чтобы одна из улиц Минска носила его имя!

А почему бы активистам кампании "Говори правду!" не организовать сбор подписей граждан в других городах с целью переименования одной из улиц (Советской, Ленина, Луначарского, Урицкого и т.д.) в улицу имени В.Быкова и тем самым устранить несправедливость и невежество властей по отношению к Великому писателю нашей республики.

Виктор КОНЦЕВЕНКО, пенсионер.

г.Речица.

ЛИЧНЫЙ ОПЫТ

«Лучше времени не тратить...»

Уважаемая редакция!

Не за горами День работника сельского хозяйства, которому я отдал 40 лет своей жизни, работал бригадиром, председателем колхоза, заместителем директора птицефабрики, директором птицефабрики. Всюду, где работал, с людьми встретиться не стыдно. В 1966 году награжден орденом "Знак Почета". В настоящее время 12 лет как на пенсии, инвалид II группы по зрению, один глаз совсем незрячий (глаукома), во втором — 0,3. Так вот, при существующей системе, системе унизительной "демократии", с Днем работника сельского хозяйства никто не поздравит даже простой открыточкой. Впрочем, если бы сам Лукашенко поздравил, я отослал бы его поздравление обратно.

Я писал во все инстанции, последний раз в газету "Советская Белоруссия". Однако результат одинаков: обращение направляли в Смолевичский райисполком тем, на кого я жаловался. Я не хочу вас даже загружать своей проблемой, просто хочу, чтобы такие, как я, прочитали это письмо и не унижались перед власть имущими, которые все равно их не поймут и отфутболят.

Геннадий Михайлович ШУКАН, ветеран труда, пенсионер.

Смолевичский район.

МАЛАВЯДОМЫЯ ТАЙНЫ ВАЙНЫ

Вермахт упадабаў Т-34, савецкія танкісты — «Штурмгешутц-III»

У ходзе аперацыі "Барбароса", калі Чырвоная Армія цярпела цяжкія паражэнні ад гітлераўцаў і адступала, немцы захапілі багатыя трафеі. Толькі на 22 жніўня 1941 года яны падбілі і захапілі 14.079 нашых танкаў. Не меней за 85 працэнтаў іх складалі лёгкія Т-26, БТ-5, БТ-7, якія мелі лабавую браню 15—20 мм, бензінавыя рухавікі і таму загараліся ад першага ж пападання нямецкага 37-міліметровага супрацьтанкавага снарада. Але былі ў ліку трафеяў і новыя танкі Т-34 і КВ-1, узброеныя 76 мм гарматай і мелі лабавую браню 47—50 мм. Яны пераўзыходзілі па агнявой і бранявой моцы самыя масавыя нямецкія танкі Т-ІІІ і Т-IV.

Займацца трафеямі, як піша ў сваёй кнізе "Танкавыя асы Германіі" вядомы расійскі гісторык, даследчык танкавых бітваў Міхаіл Барацянскі, немцам не было калі — высокія страты сваіх танкаў змушалі іх займацца рамонтам перш за ўсё сваіх машын. Але ўжо ў кастрычніку 1941 года ў руках немцаў апынулася 100 спраўных савецкіх танкаў Т-34 і КВ-1. Пасля суровай зімы 1942 года большасць кінутых на палях баёў і ў акружэнні гэтых танкаў лёгкага тыпу сталі канчаткова непрыгоднымі для выкарыстання, ператварыліся ў металалом. Аднак частку немцы здолелі пусціць у справу: адрамантавалі ў Рызе і Харкаве і ў сярэдзіне 1942 года сфарміравалі з трафейных Т-34 танкавы батальён для дывізіі "Рэйх". Некаторыя машыны без вежаў выкарыстоўваліся як цягачы для гармат і эвакуацыі з поля бою ўласных падбітых танкаў. Асобныя КВ-1, якія мелі 76-міліметровую гармату, пераўзбройваліся на нямецкую дальнабойную 75-міліметровую, здольную на адлегласці 1000 метраў паражаць амаль усе тыпы савецкіх танкаў. Лёгкія трафейныя Т-70 і Т-60, зняўшы вежы, немцы выкарыстоўвалі для буксіроўкі сваіх супрацьтанкавых 75 мм гармат. На некаторыя Т-34, зняўшы вежу, ставілі 4-ствольныя зенітныя 20-міліметровыя гарматы, якія былі вельмі небяспечнымі для нашых нізкалятаючых штурмавікоў Іл-2.

Усяго з чэрвеня 1941-га па май 1945 года немцы ўвялі ў свой строй звыш 300 савецкіх танкаў Т-34 і КВ-1.

Але і савецкія танкісты не прамінулі выкарыстаць у сваіх мэтах трафейныя танкі і штурмавыя гарматы "Штурмгешутц-ІІІ", асабліва апошнія. Яны былі вельмі небяспечнымі для нашых танкаў на полі бою. Штурмавая гармата немцамі была зроблена на базе сярэдняга танка Т-ІІІ, які меў лабавую браню ўсяго 30 мм і такую ж бартавую. Знятую з яго вежу паставілі на корпус 75 мм супрацьтанкавую гармату, на барты навесілі бранявыя "фартухі", якія ахоўвалі машыну ад пападанняў бранябойных і камулятыўных снарадаў. Лабавую браню ў самаходкі давялі да 50 мм таўшчыні. Ад высокай эфектыўнасці "Штурмгешутцаў-ІІІ" сведчыць той факт, што на Курскай дузе іх было ўжо 700 штук і яны падбілі не меней за трэць нашых танкаў.

Вось што зазначаў у сваёй справаздачы адзін з нямецкіх генералаў: "Лепшы сродак ад рускіх танкаў не "Тыгры" і "Пантэры", а штурмавыя гарматы. У іх болей дасканалыя аптычныя прыборы, нізкая пасадка і моцная лабавая браня. Лепш мець батальён гэтых машын, чым танкавую дывізію". У жніўні 1943 года экіпажы 11 "Штурмгешутц-ІІІ" пад Харкавам знішчылі 423 савецкія танкі і самаходныя гарматы, страціўшы толькі 18 сваіх машын. А ўсяго за гады вайны 11.500 "Штурмгешутц-ІІІ" падбілі 30.000 савецкіх, амерыканскіх і англійскіх танкаў!

Нашы танкісты пасля Курскай бітвы ацанілі высокія баявыя вартасці гэтай машыны. За першыя два гады вайны ў савецкім тыле набралася некалькі соцень сярэдніх трафейных танкаў Т-ІІІ. Каб не прападаць даброму, на іх ставілі самаходныя гарматы па ўзоры таго ж "Штурмгешутца-ІІІ". Знімалі вежу і ставілі сваю 76 мм гармату ад танка Т-34. Усяго было выраблена звыш 200 такіх самаходак, яны ўдала праявілі сябе ў баях. Больш за тое, з трафейных "Штурмгешутцаў-ІІІ" каля 100 машын выкарыстоўваліся ў баях, балазе трафейных снарадаў да гармат хапала. А ў час Львоўскай наступальнай аперацыі летам 1944 года ў баях з нямецкімі танкамі былі выкарыстаны два трафейныя "Тыгры", якія з засадаў у адным баі падбілі 16 танкаў ворага.

У заключэнне М.Барацянскі піша: "Это был сильный противник, который заставил себя уважать, который бил нас два долгих года, который научил нас воевать". У пацвярджэнне гэтых слоў прыводзіць такія пераканаўчыя факты: за 13 дзён Вісла-Одэрскай наступальнай аперацыі ў студзені 1945 года танкавыя карпусы Чырвонай Арміі прайшлі 550—600 кіламетраў, знішчаючы на шляху не толькі абарончыя рубяжы ворага, а і яго патрапаныя ў баях танкавыя дывізіі.

Міхаіл ТЫЧЫНА, ветэран Вялікай Айчыннай вайны.

ВОПРОС—ОТВЕТ

Что летит ко мне в окно?

По-разному люди относятся к планам городских властей вынести ряд крупных предприятий Минска за черту города, а я лично эту идею поддерживаю. Все-таки в городе мы живем, тут растут дети. Кстати, интересно было бы узнать, какие самые загрязненные районы Минска?

Ольга Васюкевич, г.Минск.

Увы, те предприятия, которые наихудшим образом влияют на экологию, как раз в планах на "переселение" не значатся.

Как сообщил председатель Минского городского комитета природных ресурсов и охраны окружающей среды Александр Боровиков, в Минске наиболее неблагоприятны по интегрированному показателю районы расположения завода отопительного оборудования, тракторного и автомобильного заводов, а также микрорайон "Шабаны". Интегрированный показатель зависит от степени загрязненности атмосферного воздуха, поверхностных и подземных вод, почвы, пояснил специалист. Основной вклад вносят выбросы крупных промышленных предприятий (ТЭЦ-4, ТЭЦ-3, МТЗ, МАЗ, заводов строительных материалов и отопительного оборудования, "Керамина") — на них приходится более 85% выбросов загрязняющих веществ от стационарных источников.

ДЕЛА ЖИТЕЙСКИЕ

В сырости и зловонии...

Дорогая редакция газеты, которая вселяет оптимизм и в которой можно говорить о том, что болит, и тебя обязательно услышат! Я не тешу себя надеждой, что после этого письма моя проблема будет разрешена... Слишком много времени, нервов и здоровья потрачено мной, а до этого моей матерью, чтобы разрешить не нами созданную проблему, и, по правде, уже нет ни сил, ни особого желания продолжать доказывать свою правоту... Просто хочется одного — пусть узнают во всей республике, какой беспредел творится в тихом скромном Ельске и как трудно (а точнее невозможно) добиться элементарной справедливости и помощи от местной власти.

Посмотрите, люди добрые, на эту фотографию. Это мой дом, перешедший по наследству от родителей. В нем жили бабушка с дедушкой, здесь я сделала свои первые шаги... Хороший дом, и стоит он в самом центре нашего городка на улице Ленинской. Жить бы да радоваться... Однако радость утоплена в этом болоте, сотворенном тогда, когда строился банк в уже далеком девяностом году прошлого века. Горисполком обещал, что по завершении строительства будет решен вопрос с отводом вод от дома. Эти "абяцанкі-цацанкі" тянутся по сегодняшний день. Не буду врать, нам предлагали коекакой обмен, но абсолютно неравноценный. Да и зачем это нам, если есть дом на земле, построенный предками. Здесь живет память... И нужно всего только пробить трубу, чтобы вода уходила с пятачка оставшейся земли возле дома, а также сделать небольшую подсыпку. Без специальной техники, понятно, здесь не обойтись. А что-то сделать своими руками просто невозможно. Вот так и маемся из года в год в сырости и зловонии. Весной, как видно на фотографии, весь участок в воде (рай для лягушек). Летом чуть подсыхает. Но как только пройдет дождь, вновь утопаем. От сырости в доме прогнил пол. На стенах — плесень. Изо дня в день этой достопримечательностью центра Ельска без зазрения совести любуется местное начальство, жители и гости городка. Вот бы сюда кого-нибудь из руководителей повыше! Интересно, по какой улице повели бы, или, может, забор бы поставили, чтобы спрятать такое позорище?..

Татьяна ЧАДЮК.

г.Ельск.

ТАК ДУМАЮ

Не абскарджваць — значыць патураць

У №№ 74—75 газета "Народная Воля" надрукавала артыкул "Брэшуць", у якім паведаміла чытачам пра ганебны факт "затрымання за дробнае хуліганства" доктара педагагічных навук А.У.Казуліна і распавяла пра тое, як брахалі міліцыянеры, узводзячы паклёп на прафесара, а суддзя — і не загарэлася на ім мантыя — пакараў штрафам у 700 тысяч рублёў настаўніка настаўнікаў.

Такіх выпадкаў у нашым сучасным жыцці набярэцца мех і ладная торба. Нездарма пры Адміністрацыі прэзідэнта была спецыяльна створана міжведамасная камісія па праверцы работы са зваротамі грамадзян, кіраўніком якой па Гомельшчыне прызначылі міністра юстыцыі В.Р.Галаванава. На асабістых прыём, які праводзіў Віктар Рыгоравіч у памяшканні Гомельскага райвыканкама 8 чэрвеня 2010 года, запісалася больш за сто грамадзян. І гэта былі далёка не ўсе, каго абразілі ўлады, у дачыненні да каго суддзі вынеслі ганебныя рашэнні.

Здавалася б, Аляксандр Уладзіслававіч Казулін павінен быў абскардзіць рашэнне суда, каб такім чынам даць прыклад барацьбы супраць хлусні і прадажніцтва, даць годны адлуп брахунам і невукам. Аднак нічога падобнага не адбылося. Казулін адмовіўся абскарджваць ганебнае рашэнне суда, чым прызнаў яго паўнамоцнасць і надалей дазволіў брахунам ад правапарадку ўзводзіць паклёпы на грамадзян.

Што ж рабіць, паважаны настаўнік Казулін, вашым вучням, шараговым грамадзянам? З каго браць ім прыклад у абароне сваіх правоў, гонару і годнасці, калі дакладна вядома, што ні Галаванаў, ні Лукашэнка ў кожны раён прыехаць не змогуць?

Неяк тое-сёе са сваіх назіранняў і поглядаў я занёс свайму настаўніку, ужо таксама прафесару, каб параіцца, пачуць яго меркаванні і словы падтрымкі.

— Зачем вы все это пишете, Николай? Неужели вот этим вы хотите изменить систему? — такім быў вердыкт прафесара.

Ці мог я сказаць настаўніку будучых настаўнікаў, што кожную сістэму ствараюць і падтрымліваюць людзі, і што яны ж могуць у межах закона мяняць яе на іншую або прыстасоўвацца да існуючых парадкаў: абы плацілі? Напэўна, мог. Але ж не сказаў. Аб чым зараз шкадую...

Мікола КАРАСЬ.

Гомельскі раён.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
27—29 ЛІПЕНЯ 2010 г.

Экс-глава ЦРУ: война с Ираном становится все более вероятной

Война с Ираном становится все более вероятной, заявил бывший директор Центрального разведывательного управления США Майкл Хейден. В интервью, данном CNN, он отметил, что считает военный удар по Ирану "не самым худшим вариантом в настоящее время".

По мнению М.Хейдена, даже если Иран вплотную приблизится к созданию ядерного оружия, это окажет крайне негативный эффект на ситуацию в мире.

Таким образом, заявление М.Хейдена свидетельствует о том, что международные санкции в отношении Ирана, похоже, малоэффективны. Впрочем, об этом ранее заявлял и президент Исламской Республики Махмуд Ахмадинежад.

Напомним, 9 июня Совбез ООН проголосовал за введение четвертого раунда международных санкций против Ирана. Так, ужесточается эмбарго против Тегерана на торговлю оружием и расширяется список иранских организаций, попадающих под действие санкций. Ирану запрещается закупать тяжелые вооружения, такие как ударные вертолеты или ракеты. Резолюция призывает принимать меры против иранских банков за границей, которые подозреваются в причастности к ядерной программе.

Напомним, что Беларусь активно налаживает сотрудничество с Ираном и даже вынашивает планы по добыче в этой стране нефти. Если на самом деле случится война, то все наши старания и деньги уйдут в песок.

«Главного палача режима Пол Пота» приговорили к 30 годам

В Камбодже бывший сторонник красных кхмеров Канг Кек Леу, которого называют "главным палачом режима Пол Пота", приговорен к тюремному заключению. Об этом сообщает AFP.

Первоначально трибунал ООН приговорил 67-летнего Канг Кек Леу к 35 годам, но этот срок позже уменьшили на пять лет. Это обосновано тем, что подсудимого несколько лет незаконно держали в предварительном заключении без решения суда. Всего Канг Кек Леу провел в предварительном заключении 10 лет.

Сергей перегоняет машины в Беларусь уже 17 лет. Прошел, как говорится, огонь, воду и медные трубы. Сегодня автоперегонщик рассказывает «Народной Воле» о трудностях и прелестях автоперегонного бизнеса, а также о том, как сэкономить на покупке машины и на чем экономить не надо.

Я помню, как все начиналось

— Начинал гонять машины я еще в 1993 году, — вспоминает Сергей. — В основном это были автомобили из Будапешта, главный контингент продавцов — цыгане. "Левую" машину купить можно было запросто, но купить — это еще полбеды. Основной вопрос был — благополучно доехать домой. Бандиты на дорогах — это был сущий кошмар. Вот, например, в Венгрии старались не заправляться, потому что там было дорого. Ждали, как манны небесной, пока доберешься до украинской территории. А времена-то какие были! Союз только-только приказал долго жить... В Украину приезжаешь, а там нет ничего — ни бензина, ни дизельного топлива. Развал же был кругом! В Западной Украине торговцы стояли прямо на дорогах с канистрами. Вроде и заправиться надо, а опасно. Вышвырнут из машины — и до свидания. Но одно радовало: в Минске в те времена все машины на рынке продавались моментально. Только-только открылся авторынок в Малиновке, приезжали россияне и прямо поездами скупали авто. Не успевал заехать на рынок, как у тебя ее уже покупали. Тогда даже понятия такого не было, чтобы перед продажей помыть машину или ее отполировать. Максимум, что я делал, так это коврики вытряхивал. Не успел вытряхнуть, как уже в окошко стучат: "Сколько?" Тогда можно было торговать три дня — пятницу, субботу и воскресенье. Кстати, въезд на рынок был копеечным по сегодняшним меркам — долларов 10.

Издержки производства

— Сколько раз в месяц ездили за машиной?

— Как правило, раз в неделю. В будние дни пригонял машину и, если за выходные не успевал продать, то уже считался неудачником.

— А на чем отправлялись?

— В основном автобусами. Проблема была только с провозом валюты — можно было вывезти до 500 долларов, так что прятали кто как мог. Кто в салоне автобуса, кто в батон, кто в курицу... Иначе никак.

— Раньше много говорили о рэкете на дорогах...

— Не скрою, одно время было даже очень страшно. И полбеды, если машину у тебя просто отобрали. Но сколько перегонщиков недосчитались! Люди просто пропадали на дорогах. В Украине, Польше... Хотя в той же Польше кто из бандитов работал? Выходцы из бывшего Союза. Молдаване, украинцы, белорусы... Поляки по большому счету навели у себя порядок лишь тогда, когда вошли в еврозону. А так бардак там был такой, что просто кошмар. Грабили ведь не только машины, но даже и поезда! Помнится, был международный скандал, когда московский поезд грабанули, как в вестерне.

— А что полиция?

— Полиция в основном тоже была продажная. Сколько раз было такое, что полицейские останавливали тебя не для проверки документов, а просто, чтобы подставить. Останавливают, а в стороне уже стоят "братки" и смотрят на тебя, как на овцу. Полиция уезжает, бандиты делают свое дело. Да и сами польские полицейские — как транзитные номера увидели, так уже не отцепятся. Вот немецкая полиция — это совсем другое дело. Если ты ничего не нарушил, ничего не "накосячил", то никогда в жизни тебя не остановят. Даже для проверки документов. После Венгрии я и начал работать в Германии, Голландии, Бельгии, Италии...

«Я не такой богатый, чтобы покупать дешевые вещи...»

— В начале этого года начался самый настоящий бум, когда стало известно, что с 1 июля 2010 года введут новые таможенные пошлины на автомобили, которые приравняют к российским...

— О, я уже давно такого ажиотажа не видел. Люди чтобы накупить машины, попродавали квартиры, понабирали кредитов. И что дальше? Сейчас они не знают, куда эти машины девать. Поэтому сейчас цены на самом деле пошли вниз. Можно выждать время и взять довольно-таки приличную машину за, скажем так, небольшие деньги.

— А где выгоднее покупать — в Европе или Минске?

— Все машины, которые продаются на нашем рынке, они же не заказные, а куплены "под рынок". Соответственно, если куплены "под рынок", то людям нужна приемлемая цена. То есть человеку в первую очередь нужна цена, а уже затем все остальное. И народ покупает по принципу лишь бы машина была дешевле, но свежее. Это натуральная тупость, потому что "под рынок" так называемые свежие машины идут с проблемами. Литовцы, например, многие машины затаскивают к себе автовозами, но по большому счету эти автомобили собираются по всей Европе. Среди них — битые, их затем восстанавливают специальные умельцы. Есть и лизинговые машины, которые 3—5 лет сдавались напрокат. Цена у них, конечно, привлекательная, машина почти новая, но прокатное авто — всегда проблема, если вы берете машину для себя... Итальянские водители, бельгийские, французы — это все варвары. Так, как немцы, — никто к машинам не относится. Для немцев автомобиль — это как член семьи. В выходной день он ее помоет, хотя этого можно и не делать, пропылесосит. Будет ремонтировать не тогда, когда "приперло", а просто потому, что пришло время. Немец не ждет, пока что-то, как у нас говорят, "ляснется". Хотя, вы знаете, и немцев разных хватает. Сейчас же там много эмигрантов — турок, арабов, русских. Немец уже немного не тот. Но если ты покупаешь машину у немца в автохаусе, то будь спокоен — авто в порядке. Как там в пословице: я не такой богатый, чтобы покупать дешевые вещи.

— Очереди были большие, когда народ хлынул за машинами?

— Не особо, потому что в основном все стали привозить машины автовозами. Своим ходом редко гнали машины, если это не был конкретный заказ. С автовоза все шло на рынок. За эти полгода в Беларусь затащили столько машин, что сейчас на рынок не заехать. Несколько лет еще будут продавать. На рынке в Малиновке более дорогие машины, но там можно свободно поехать и торговать. Хотя этот рынок в последнее время сдает "позиции" — мало там покупателей. А вот рынок в Ждановичах забит под завязку. Там ставят машины с четверга утром, чтобы торговать в субботу и воскресенье.

— Тяжелая работа у перегонщика?

— Многие вообще не считают, что это работа. Мол, поехал, купил, "наварил" — романтика. Но, как я уже говорил, не все так просто. 17 лет гоняю машины, но всегда сталкиваюсь с чем-то новым. Это не так просто — поехать и притащить машину домой. Очень много нюансов, которые нужно знать. А самое главное для перегонщика — должны присутствовать собранность и аккуратность. Только тогда клиент будет тебе доверять!

Алесь СИВЫЙ.

НАДВОР'Е

На фінале вяслярнага чэмпіянату спартсмены і трэнеры страчвалі прытомнасць

На чэмпіянаце свету па веславанні ў Брэсце ўдзельнікі валіліся ад перагрузак, трэнеры — ад млявасці, а заўзятары — ад спёкі.

Пра гэта паведаміў "Еўрарадыё" адзін з супрацоўнікаў спартыўна-медыцынскай службы.

Толькі за адзін дзень 25 ліпеня пасля фінішу медыкі фактычна вярнулі свядомасць тром веслярам. Учора ўпалі з веласіпеда два трэнеры. У аднаго — складаны пералом, у другога — глыбокі парэз. Прычына — млявасць. Адзін са спартсменаў атрымаў пераломы двух пальцаў: яму на руку ўпала лодка, калі яе ставілі на рэлінг. Аказвалі медыцынскую дапамогу і шматлікім заўзятарам веславання.

Большасць дзён чэмпіянату ў Брэсце было за 30 градусаў у ценю, але, дзякуй Богу, абышлося без лятальных выпадкаў.

Дарэчы, сіноптыкі прагназуюць, што на гэтым тыдні таксама будзе трымацца гарачае надвор'е, а вось жнівень будзе лягчэйшым.

БУДЗЬЦЕ ГАТОВЫ!

Дзіцячыя спартыўныя секцыі будуць платнымі

У бліжэйшы час усе спартыўныя секцыі краіны пачнуць браць плату за навучанне дзяцей.

Адпаведную вусную згоду днямі даў Аляксандр Лукашэнка, разважаючы на тэму неабходнасці самаакупнасці спартыўных аб'ектаў.

"Мы не адаб'ем грошы, якія ў гэтыя аб'екты ўкладзеныя. Але яны павінны сябе ўтрымліваць", — заявіў Аляксандр Лукашэнка, запэўніўшы, што будаўніцтва спартыўных і культурных аб'ектаў у краіне будзе працягнута.

На яго думку, сёння бацькі могуць часткова плаціць за заняткі дзяцей у спартыўных секцыях. Бясплатна навучацца будуць толькі дзеці, на якіх трэнеры ўскладаюць асаблівыя надзеі.

МАЙЦЕ НА ЎВАЗЕ!

Аматары купацца ў мінскіх фантанах рызыкуюць схапіць інфекцыю

Вада ў фантанах Мінска не прызначана для купання ці выкарыстання ў гігіенічных мэтах. Таму няма гарантый таго, што яна бяспечная для здароўя, заявіла галоўны тэрапеўт Камітэту аховы здароўя Мінгарвыканкама ***Алена Філіпава****.*

Калі ж чалавек усё ж хоча ахаладзіцца ў фантане, яму, прынамсі, не варта мыць у гэтай ваадзе твар, тлумачыць спецыяліст. Так павялічваецца рызыка схапіць розныя інфекцыі. Мыць у фантанах садавіну і гародніну і піць такую ваду таксама нельга.

Вельмі шмат, аднак, залежыць ад таго, з якіх крыніц паступае вада ў той ці іншы фантан. Напрыклад, два фантаны ў Ленінскім раёне (адзін — у Аляксандраўскім скверы, а другі — ля будынка раённай адміністрацыі, што на Маякоўскага), напаўняюцца вадой з артэзіянскіх крыніц і праз водаправод. А вось у фантане каля Нацыянальнай бібліятэкі вада са Сляпянскай воднай сістэмы, у якой забаронена купацца.

Царква прыйшла ў школу

З новага навучальнага года ў сістэме сярэдняй адукацыі Беларусі ад 1-га па 11-ты класы будзе ўведзена вучэбная праграма факультатыўных заняткаў "Асновы праваслаўнай культуры. Праваслаўныя святыні ўсходніх славян".

Праграма курса прайшла ўсе неабходныя ўзгадненні, у тым ліку ў Нацыянальным інстытуце адукацыі і ў Мінадукацыі. Такая праграма, якая ахоплівае ўвесь перыяд навучання ў школе, уводзіцца ўпершыню. Заняткі па ёй не з'яўляюцца абавязковымі.

С МОЕЙ КОЛОКОЛЬНИ

Я на дачу еду, плача...

Когда появился этот перефраз строки из песни В.Высоцкого? Наверное, когда советскому горожанину, только-только массово переселившемуся из коммуналок в "хрущевки" и "брежневки", стали давать еще и сотки. Своя дача! Как вдруг освежили нашу кровь новым смыслом эти 4, потом 6 соток неудобиц, бросовых земель... Потому что собственность. Свое. И дело не в доходе от огорода. Копай глубже! Многие начали выращивать там не только огурцы и флоксы — чувство хозяина. Но, правда, ни купить толковые стройматериалы, ни построить добротный дом было невозможно. Специально запрещено. Чтобы не обольщались. Оттого, наверное, и рыдал в душе законопослушный советский гражданин. Ему-то хотелось башенок, как в сказках братьев Гримм, ему уже тогда мерещились эркеры... Но до перестройки (в данном случае и в прямом, и в переносном смысле) еще надо было дожить. Ох, дожить...

Впрочем, история советских дач восходит... Да она никогда и не прерывалась, эта история! Другое дело, что сначала в государстве дачи не были массовым явлением. Дачи были ведомственные. А также правительственные. Они выделялись. В бесклассовом советском обществе они тем не менее свидетельствовали о социальном статусе владельца, то есть о его "классе". Дачи были бонусом к государственной должности либо званию: академика, народного артиста, писателя. И часто забирались государством с уходом ордено-должности-звания-носца на пенсию. Хозяевами на них люди были условными. Но вот атмосфера там была в чем-то уникальная. Она, естественно, ушла... Не скажу, что — жаль. Просто между днем сегодняшним и вчерашним всегда есть смысловое напряжение.

У моего дедушки Ивана Сергеевича Молочко, первого замминистра сельского хозяйства БССР в 1940—1950-х годах, была совминовская дача в Городищах. Нижняя. Потому что "верхние" дачи, около озера, давались министрам и выше. А замам и ниже, значит, — через дорогу в лесу, "где вечно сыро", жаловалась бабушка. Очень скромные деревянные дома без удобств на несколько семей. Конечно, деталей я помню мало, ведь в начале шестидесятых дедушка ввиду пенсионного возраста свой пост оставил, и дачу у семьи забрали. Но все-таки.

Первое — это пропуска. На "верхние" дачи, где главное детское счастье — озеро, дамба, раки (они, ей-богу, водились в Городищах!), без пропуска не пускали. Я представляю, каково было местным, деревенским — стоять под совминовским забором... У взрослых же на "верху" был свой интерес — хороший магазин. Продукты всегда были проблемой даже для совминовских семей.

Дух сословности проникал всюду. Женщины вели себя соответственно положению мужей. Верховодили те, чьи супруги занимали более высокую должность. Но чем же занимались совминовские дамы летом? Ведь грядок на дачах не было категорически! Не престижно! И все вокруг было казенное, не требовало ни ухода, ни внимания. В домах на "верхних" совминовских дачах даже мебель в комнатах была под номерами, а у моей подруги в столовой на стене вообще висел портрет Ленина. Много позже она призналась, что мама очень хотела Ленина из столовой убрать. Но боялась. Нет, номенклатуру уже не сажали. Но внутренние ограничители еще очень сильно работали. Вот те же грядки. Официально никто не запрещал их иметь под окнами. Но они имели привкус собственности, "личного интереса". Это осуждалось... Моя бабушка тем не менее вскопала под елкой квадратик земли для петрушки. И, помню, всегда шутливо клялась, что выращивает ее не для еды, а в косметических целях — против веснушек на лице. Иметь прибыль с земли было неприлично, считалось мещанством. Это слово было тогда в большом ходу.

Итак, за усадьбой смотреть не было нужды, наши дома стояли на балансе совмина, и "министерши", как все жены на земле, занимались детьми-внуками, обедами. И разговорами. Вечером, помню, общество собиралось на гамаках на общей поляне или у нас за круглым столом под старой елью — поиграть в карты. На небольшие деньги. Хоть копеечки. Ставилась бутылочка коньячка. Или портвейна. Хорошие конфеты. Бутылку эту пили рюмочками неделями — так, больше смачивали язык для форса. Потом пели романсы под гитару на два-три голоса... Это было очень красиво. Женщина пятидесятых должна была уметь петь! Это было в моде... Телевизоров на дачах не было. Да и в городе не у каждого. Зато в большом ходу радиолы и пластинки. "Рио Рита" неслась отовсюду... Мужья навещали своих жен далеко не каждый день. Телефон — по тем временам неслыханная роскошь — был один на весь наш дачный поселок в 10 хозяев (стоял в деревянном сарае). То есть люди друг с другом не переговаривались ежечасно, как теперь, и жизнь совсем недалеко от столицы текла в Городищах обособленно, расслабленно, умиротворенно.

Дедушка появлялся на даче в субботу ближе к вечеру, снимал пиджак, галстук, шляпу. Переодеться в майку? Шорты? Ни боже мой! Иногда позволял себе выйти в пижаме. Но вообще тогда на дачах не носили старья — рядом же сослуживцы, даже подчиненные! И всегда в его руках, помню, была газета. Читала всю партийную прессу и его жена, моя бабушка. Кстати, ей сейчас 96, читать она уже не может, глаза подводят, но зато жадно слушает все информационные выпуски новостей по радио и телевидению и верит каждому произнесенному оттуда слову. "Лена, разве можно критиковать правительство?" — с подозрением глядя, иногда спрашивает она меня. Я стараюсь не ввязываться в дискуссию. Тем более что система иерархии никуда из нашего общества не ушла. Только видоизменилась. Причем знаете, какое у меня наблюдение? Сегодня дети и внуки той трижды прогнившей советской элиты — это тем не менее самая либеральная и образованная часть нашего общества. Большинство из них занимается наукой, творчеством, педагогикой и искренне исповедует демократические ценности, не участвуя в шкурных битвах "у корыта". А правят бал в обществе, как всегда, "Шариковы", те, кто стоял когда-то за дачным забором. И наблюдал...

Маятник качнулся. До поры до времени справедливо.

Елена МОЛОЧКО.

СЛЫШАЛИ?

Муравьиный праздник

В последнее время в Минске появилось огромное количество муравьев. Они повсюду! Откуда взялись насекомые и не опасны ли они для людей?

Старший преподаватель кафедры зоологии биологического факультета БГУ кандидат биологических наук Виктор Хвир объясняет:

— В это время у черных садовых муравьев (Lasius niger) начинается период брачного лета. Самцы и самки выползают на улицы в поисках пары. Оплодотворенные самки отправятся на поиски места для новых муравейников. В нынешнем году аномальное увеличение количества муравьев связано с высокой температурой и влажностью. В таких условиях все беспозвоночные активнее добывают пищу и размножаются.

— Как долго продлится "муравьиный праздник"?

— Обычно пик их активности длится 1—2 дня. Тогда насекомые массово и синхронно покидают муравейники. Но постепенно нашествие пойдет на спад, потому что многие особи погибнут. Правда, из-за солнечной, жаркой погоды муравьев может быть много еще около недели. Скорее всего их станет больше ближе к паркам и Минской кольцевой дороге, куда самки отправятся создавать новые дома. Кстати, в следующем году должно возрасти количество муравейников.

— Представляют ли они какую-нибудь опасность для человека?

— Не стоит бояться садовых муравьев. Они слишком мелкие, чтобы прокусить даже кожу ребенка.

А как относятся к армиям насекомых в Центре профилактической дезинфекции санитарно-эпидемиологической службы города Минска? Отвечает энтомолог Елена Терлецкая:

— Мы уничтожаем только рыжих домовых муравьев, которые досаждают минчанам круглый год. Кстати, в связи с жаркой погодой их тоже стало больше, чем обычно. Черные садовые муравьи не опасны для здоровья человека. Они не переносят никаких заболеваний, не кусаются. Это очень полезные общественные насекомые.

Interfax.by

ЗАКУЛІССЕ

Беларускія чыноўнікі не падтрымалі ініцыятыву літоўскіх веласіпедыстаў

Літоўскі прэм'ер Андрус Кубілюс разам з паплечнікамі і сябрамі выправіўся ў веласіпедную вандроўку. Падарожжа праходзіць у тым ліку і па тэрыторыі Беларусі. Далучыцца да экалагічнага адпачынку літоўскі бок прапанаваў і беларускім чыноўнікам.

Нягледзячы на прапаганду здаровага ладу жыцця ў Беларусі, айчынныя прадстаўнікі ўлады не паставіліся сур'ёзна да прапановы літоўскага прэм'ера кінуць усе справы і выправіцца ў сапраўдную вандроўку. Ідэю ўсім разам "выкаціцца" на прасторы нашай краіны агучыў завадатар паездкі на роварах — прэм'ер Літвы **Андрус Кубілюс** падчас свайго нядаўняга візіту ў Беларусь. Ініцыятар падарожжа сабраў кампанію з 30 чалавек, сярод якіх самыя ўплывовыя людзі суседняй краіны: міністр сацыяльнай абароны і труда **Данатас Янкаўскас**, міністр эканомікі **Дайнюс Крейвіс**, намеснік старшыні парламенцкага Камітэта па бюджэце і фінансах **Вітас Матузас**, частка парламенцкага Камітэта па справах сяла **Эдмундас Пупініс** і іншыя бізнесмены і чыноўнікі.

Безумоўна, вандроўка па Беларусі стала яшчэ адным доказам "адлігі" ва ўзаемаадносінах паміж Вільнюсам і Мінскам. Цікавы факт, але яшчэ некалькі гадоў таму той жа самы Андрус Кубілюс падчас свайго старшынства ў апазіцыйнай Кансерватыўнай партыі выказваў думкі, далёкія па інтанацыі ад мілай сяброўскай прапановы сумеснага шпацыру.

"Літва павінна ясна заявіць, на чыім яна баку, — колісь заяўляў Кубілюс. — *І гэта гульня з адміністрацыяй Лукашэнкі з надзеяй, што такімі гульнямі можна чаго-небудзь дасягнуць, нікуды не вядзе"*.

У гэтым годзе спадар Кубілюс быў куды больш карэктным, прапанаваўшы беларускім палітыкам далучыцца да агульнай вандроўкі. На жаль, нашы чыноўнікі ўстрымаліся ад такога праяўлення сяброўства. Як паведамілі "Народнай Волі" ў прэс-службе прэзідэнта Беларусі, ні Аляксандр Лукашэнка, ні старшыня беларускага ўрада Сяргей Сідорскі не збіраюцца далучацца да літоўскай паездкі. Канечне, гэта звязана не толькі са спартыўнымі густамі першых асоб дзяржавы. Хаця Лукашэнка калісьці прызнаўся, што не ўсе спартыўныя забавы для яго дасяжныя.

"Я футбаліст — нага мяне прымусіла гуляць у хакей, — скардзіўся прэзідэнт на лёс. — *Калі б у мяне меніск не быў раздроблены, дарэчы, у футболе траўму атрымаў, я б дагэтуль гуляў у футбол"*.

Што тычыцца прэм'ера Сідорскага, ён толькі нядаўна вярнуўся з адпачынку і заняты дзяржаўнымі справамі.

30 літоўскіх чыноўнікаў плануюць да 1 жніўня катацца па Беларусі, спыняючыся ў такіх пунктах, як Нясвіж і Ліда. Заўважым, што нефармальны характар падарожжа не зусім вытрыманы — разам з літоўскімі службовымі асобамі едзе ахова і іншыя службы падтрымкі.

Дарэчы, Андрус Кубілюс — вялікі аматар велапаходаў, таму на Беларусі падарожжа не спыніцца. Фінальным акордам адпачынку для яго і яго жонкі Расы стане велапаездка ў Германію. У рэшце рэшт, можна дадаць яшчэ азін цікавы факт. Калісьці спадар Кубілюс запрашаў на велавандроўку і свайго калегу з Расіі. Як і беларускія палітыкі, Пуцін праігнараваў такую магчымасць.

Марыя МАЛЕВІЧ.

ФУТБОЛ

БАТЭ зноў пайшоў у адрыў

У мінулую нядзелю адбыліся матчы 19-га тура Нацыянальнага чэмпіянату Беларусі па футболе. Вось іх вынікі:

"Нёман" (Гродна) — "Мінск" — 0:1, "Партызан" (Мінск) — "Тарпеда" (Жодзіна) — 2:3, "Віцебск" — "Дынама" (Брэст) — 0:1, "Нафтан" (Наваполацк) — "Белшына" (Бабруйск) — 4:0, "Днепр" (Магілёў) — БАТЭ (Барысаў) — 0:2, "Дынама" (Мінск) — "Шахцёр" (Салігорск) — 0:1.

Турнірнае становішча пасля 19-га тура

Каманды	Г	В	Н	П	М	А
1. БАТЭ	19	12	6	1	32—4	42
2. Шахцёр	19	10	7	2	26—11	37
3. Мінск	19	11	3	5	32—15	36
4. Дынама (Мн)	19	11	3	5	29—13	36
5. Белшына	19	8	4	7	18—24	28
6. Дынама (Бр)	19	7	6	6	26—20	27
7. Днепр	19	6	4	9	16—31	22
8. Нафтан	18	4	8	6	18—16	20
9. Віцебск	19	3	9	7	17—27	18
10. Нёман	19	2	9	8	12—23	15
11. Тарпеда	18	3	4	11	19—34	13
12. Партызан	19	2	5	12	10—37	11

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
27—29 ЛІПЕНЯ 2010 г.

МАЗАІКА

Беларускія штурхальніцы ядра — на п'едэстале

Беларуская штурхальніца ядра Надзея Астапчук (на фота) выйграла 10-ы этап Брыльянтавай лігі па лёгкай атлетыцы, які праходзіў у Монтэ-Карла.



З вынікам 20 метраў і 23 сантыметры Астапчук заняла першае месца, апярэдзіўшы галоўную канкурэнтку Валеры Вілі на 3 сантыметры. Трэцюю прыступку заняла яшчэ адна беларуска Наталля Міхневіч. Яна штурхнула снарад на 19 метраў 43 сантыметры.

Эдуард Малафееў узначаліў піцерскае «Дынама»

Кантракт з вядомым беларускім футбольным спецыялістам падпісаны да канца бягучага сезона з магчымасцю працягнення яшчэ на адзін год.

Нагадаем, што ў 2009 годзе Эдуард Васільевіч ужо трэніраваў гэтую каманду, якую вывеў у першы дывізіён чэмпіянату Расіі. Зараз перад Малафеевым стаіць задача замацавацца з "Дынама" ў першым дывізіёне.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Камерунскі футбаліст Гі Франсуа ТУКАМ:

«Знаходзячыся ў беларускай турме, хацеў забіць сябе»

Камерунскі футбаліст Гі Франсуа Тукам распавёў пра ўмовы ўтрымання ў мінскім ізалятары, аб пабоях, турэмнай ежы, расісцкіх "жартах" сукамернікаў

За паўтара месяца "адпачынку" на Акрэсціна яму прыйшлося заплаціць 250 долараў.

Нагадаем, 28-гадовы Гі Франсуа Тукам — камерунскі галкіпер, які жыве ў Еўропе і мае від на жыхарства ў Іспаніі яшчэ 1 чэрвеня бягучага года прыляцеў у Мінск, каб згуляць за нарвежскі футзальны клуб IOF, на гульню Кубка еўрапейскіх чэмпіёнаў па футзале. Аднак яго затрымалі прама ў мінскім аэрапорце, падазраючы ў падробцы пашпарту.

Прайшло 44 дні, пакуль беларускі бок упэўніўся ў тым, што і камерунскі пашпарт футбаліста і яго від на жыхарства ў Іспаніі — сапраўдныя. Увесь час, пакуль ішло разбіральніцтва, ён знаходзіўся ў прыёмніку-размеркавальніку на Акрэсціна.

Крыху больш за тыдзень таму ён, схуднелы, у язвах і ссадзінах прыляцеў у Іспанію. Там яго сустрэла каханая дзяўчына Інмакулада Гансалес, якая ўвесь гэты час змагалася за вызваленне спартсмена.

Журналісты "Еўрарадыё" дазваніліся ў Іспанію і папрасілі камерунскага спартсмена расказаць аб падрабязнасцях затрымання і ўтрымання ў прыёмніку-размеркавальніку на Акрэсціна.

— Віншуем з заканчэннем непрыемнай гісторыі і вяртаннем дамоў! Як вы сябе адчуваеце зараз? Ці змаглі аднавіць уласнае здароўе за час, які прайшоў пасля вызвалення?

— Паціху аднаўляюся. Зараз адчуваю сябе добра, бо знаходжуся ў краіне, якая паважае правы чалавека. Тут усё спакойна, без праблем.

— Як пачыналася гісторыя з затрыманнем?

— Я грамадзянін Камеруна, але жыву ў Іспаніі, маю тут від на жыхарства. Ехаў з сябрамі з Нарвегіі гуляць у Мінску ў футбол. Жанчына, якая правярала мае дакументы ў мінскім аэрапорце, паглядзела на маё фота і сказала: "Гэта не тваё фота, а твайго брата". Я паказаў сваё пасведчанне аб іспанскім відзе на жыхарства. Кажу: "Калі ў мяне еўрапейскае пасведчанне, як я мог узяць пашпарт брата, з тым каб прыляцець у Мінск?

Пачаліся разбіральніцтвы, мне загадалі ўзняцца наверх. Потым сказалі, быццам бы дакументы несапраўдныя. Я спрабаваў растлумачыць сітуацыю на англійскай мове, але мяне не разумелі. Ці рабілі выгляд, што не разумелі. Можа, хацелі грошай ад мяне?..

— Ці адбыўся суд? Ці прадаставілі вам перакладчыка, адваката?

— Ніякага суда не было. Нейкая жанчына задала мне некалькі пытанняў на англійскай мове на чацвёрты дзень знаходжання ў аэрапорце. Тады яны адразу павялі мяне ў машыну і павезлі туды, дзе я знаходзіўся ўвесь астатні час. Я казаў, каб мне далі адваката, казаў, што хачу бачыць сваю справу. Мне адказалі: "Ніякага адваката няма, замаўчы, пойдзем!"

Праз пару тыдняў зняволення мяне праз перакладчыка спыталі, ці ёсць у мяне грошы, каб аплаціць сваё зняволенне. Сказалі, што я павінен заплаціць 250 долараў. І параілі: "Тэлефануй сваёй дзяўчыне, скажы, каб яна пераслала". У выніку яна пераслала гэтыя грошы і грошы за білет на самалёт, іх заплаціў консул Іспаніі.

— Распавядзіце аб умовах утрымання на Акрэсціна.

— Да людзей там няма абсалютна ніякай павагі. Замежнікі не маюць там ніякіх правоў. Нават злачынцы маюць права прымаць душ, тэлефанаваць. Душ можна прыняць толькі раз на тыдзень і толькі калі просіш, патрабуеш. Я 44 дні правёў без прагулак. У мяне забралі ўсе асабістыя рэчы. Ложкаў няма, людзі спяць на драўлянай лаўцы...

Замежнікі сядзяць там не асобна, а разам з бамжамі, усе разам... Сярод зняволеных ёсць яўна хворыя людзі. Некаторыя людзі паводзяць у зняволенні па 7—8 месяцаў і калі іх адпускаюць на прагулку, яны проста не могуць хадзіць!

— Чым вас кармілі ў зняволенні, колькі разоў?

— Ежа, якую там даюць, зусім не падыходзіць людзям. Суп — гэта проста салёная вада з нечым... Я не ведаю, як гэта называецца. Кідаюць лыжку ў талерку і ўсё! Даюць яшчэ кавалак белага хлеба. Я каля 40 дзён піў толькі гарбату і харчаваўся белым хлебам. Ваду даюць не пітную, ёсць толькі водаправодная вада дрэннай якасці. За час зняволення я згубіў 20 кілаграмаў.

— Ці дазвалялі тэлефанаваць дамоў, атрымліваць лісты ад сваякоў?

— Не. Беларускія праваабаронцы неяк перадалі мне пакет з рэчамі — мылам, кнігай... Але ліст ад дзяўчыны не прапусцілі. Толькі калі я выйшаў на волю, сядаючы ў самалёт, прачытаў яго.

— Як да вас ставіліся надзіральнікі?

— Вельмі часта пагражалі! На 37-ы дзень зняволення я адмовіўся ад ежы і пітва, запатрабаваў урача. Тады два надзіральнікі мяне збілі. Я спрабаваў у іх спытаць, за што мяне трымаюць у такіх умовах.

Я хацеў сказаць ім: "Паглядзіце, я не злачынца, нікога не забіў, не абрабаваў, не прадаваў наркотыкі, не прыехаў сюды жыць!. Я замежнік, да мяне трэба нармальна ставіцца, размясціць у цэнтры для эмігрантаў. Яны сказалі: "Ідзі..."

Яны не разумелі, што я хацеў ім сказаць, пачалі сварыцца. Параілі не выступаць, а то справа зменіцца ў яшчэ горшы бок.

— Хто з вамі сядзеў у камеры? Якія ў вас адносіны склаліся з сукамернікамі?

— Нас было дзевяць чалавек. Былі людзі з Украіны, Расіі. Кожны дзень расісцкія штучкі, увесь час пагражалі мне. Мне пашчасціла, што быў яшчэ хлопец з Малдовы, які размаўляў па-англійску. Ён дапамагаў мне размаўляць з надзірацелямі. А калі ён выйшаў, то я не размаўляў з імі зусім — яны замежнай мовы не разумеюць. Паказваў жэстамі.

— Правёўшы амаль паўтара месяца ў ізаляцыі ў чужой краіне, без прававой дапамогі, асабістых рэчаў і без сустрэч з сябрамі — пра што думалася?

— Я пачаў думаць, што маё жыццё скончылася. Пасля 40 дзён зняволення з'яўляліся думкі забіць сябе.

— Ці паедзеце ў Беларусь яшчэ раз, скажам, на футбольную гульню?

— Не, ні ў Беларусь, ні ў Расію, ні ва Украіну. Пры ўсёй павазе да краіны, але маючы такі горкі досвед... Перадаю вялікую падзяку беларускім праваабаронцам, якія дапамагалі мне! Перадалі мне мыла, ваду, кнігу, некаторыя іншыя рэчы! Заклікаю іх не спыняцца і змагацца далей. Таму што там ёсць людзі, якія літаральна паміраюць! Пасля паўгода праведзенага ў такім зняволенні яны ледзьве могуць хадзіць, губляецца сіла, зрок...

ВАКОЛ СПОРТУ

Дарагі сувенір

Адзін з мячоў, які выкарыстоўваўся падчас фінальнай гульні паміж зборнымі Іспаніі і Галандыі на прайшоўшым чэмпіянаце свету па футболе, прададзены на інтэрнет еВау за 74 тысячы долараў.

Імя пакупніка, які набыў такі "сувенір" у 500 разоў даражэй за ягоны намінальны кошт, не называецца.

Для параўнання: мяч "Ратэйра", які выкарыстоўваўся ў 1/4 фіналу чэмпіянату Еўропы-2004 года ў Партугаліі ў матчы зборных Англіі і Партугаліі, быў прададзены за 43 тысячы долараў.

Атрыманыя ад продажу грошы пайшлі ў дабрачынны фонд па барацьбе са СНІДам, які ў сваёй назве мае лічбы 46664. Для паўднёваафрыканцаў гэты нумар амаль свяшчэнны, паколькі падчас апартэіду гэта быў нумар зняволеннага на востраве Рабена Нэльсана Мандэлы, які пазней стаў першым цёмнаскурым прэзідэнтам ПАР і вызваліў краіну ад апартэіду.

Прададзены мяч называецца Jabulani. З зулускай мовы гэта перакладаецца як "весялосць". Ён зроблены па спецыяльнай тэхналогіі, якая павінна была значна палепшыць ягоныя аэрадынамічныя якасці.

Праўда, некаторыя футбалісты скардзіліся на непрадказальныя "паводзіны" гэтых мячоў у палёце, нягледзячы на тое, што кампанія-вытворца сцвярджала, што тэхналогія вырабу мяча, наадварот, павінна палепшыць аэрадынаміку.

Нацыянальнае ўпраўленне ЗША па аэранаўтыцы і даследаванні касмічнай прасторы (NASA) нават правяло даследаванне, па выніках якога пацвердзіла, што мяч Jabulani пры палёце на вялікай хуткасці паводзіць сябе непрадказальна.

Аднак, як мяркуюць прадстаўнікі кампаніі, якая праводзіла інтэрнет-аўкцыён, супрацьлеглыя адзнакі афіцыйных мячоў чэмпіянату свету толькі ўзмацнілі цікавасць да гэтага лота.

Варта адзначыць, што непрадказальны Jabulani стаў адным з самых жаданых сувеніраў гэтага першынства. Па падліках экспертаў, на яго продажы кампанія-вытворца зарабіла больш за мільярд долараў.

Тайгер Вудс — самы багаты спартсмен планеты

Згодна са штогадовым рэйтынгам амерыканскага часопіса Sports Illustrated, спартсменам з самымі вялікімі даходамі ў свеце з'яўляецца гальфіст Тайгер Вудс. Даходы Тайгера Вудса толькі ў 2010 годзе склалі 90,5 мільёна долараў.



У параўнанні з паказчыкамі мінулага года даходы Вудса ўпалі на 10 працэнтаў, аднак гэтае падзенне не адбілася на пазіцыі гальфіста ў спісе. У 2008 годзе яго заробак склаў 127,9 мільёна долараў, такім чынам за два гады даходы Вудса ўпалі на 40 працэнтаў.

Другі радок у амерыканскім рэйтынгу займае яшчэ адзін гальфіст — Філ Мікельсан. У 2010 годзе ён зарабіў 61,7 мільёна долараў.

Тройку лідэраў спіса замыкае баксёр Флойд Мэйуэзэр-малодшы. З даходам у 60,2 мільёна долараў.

Яшчэ адзін спіс, падрыхтаваны выданнем, прадстаўляе 20 самых багатых спартсменаў-неамерыканцаў. Яго ўзначальвае швейцарскі тэнісіст Роджэр Федэрэр. Яго даход — 61,7 мільёна долараў.

ПА-ЗА ГУЛЬНЁЙ

Ліквідацыя «Кераміна» — хакейнае рэфармаванне

"Што будзе з "Керамінам"? Пад такім загалоўкам у адным з мінулых нумароў "Народнай Волі" выйшла публікацыя, у якой распавядалася пра тое, што двухразовы чэмпіён краіны па хакеі — сталічны "Керамін" можа спыніць сваё існаванне.

Зараз з упэўненасцю можна сказаць, што "Кераміна" больш няма. Пра расфарміраванне сталічнай каманды на мінулым тыдні было заяўлена афіцыйна.

Хаця яшчэ адразу пасля таго, як хакеісты мінскай каманды выйшлі з адпачынку, нічога не абяцала бяды ні ім, ні прыхільнікам каманды. Хакеісты і трэнеры адправіліся на першы перадсезонны збор у Раўбічы, дзе распачалі падрыхтоўку да новага сезона.

Чуткі аб тым, што хакейны "Керамін" можа спыніць сваё існаванне, папаўзлі на пачатку бягучага месяца. У балельшчыцкіх колах пагаворвалі аб тым, што генеральны спонсар каманды — аднайменнае прадпрыемства адмаўляецца фінансаваць хакейную каманду. Але гэта былі толькі плёткі. Проста ў айчынных хакейных вярхах вырашылі, што завод "Керамін" павінен спансіраваць іншы хакейны праект — мінскае "Дынама", якое ўжо два гады, мякка кажучы, не вельмі ўдала прадстаўляе Беларусь у Кантынентальнай хакейнай лізе. А хакеісты мінскага "Кераміна", па задумцы кіраўніцтва федэрацыі, павінны ўзмацніць іншыя хакейныя клубы.

Балельшчыкі, а "Керамін" і сапраўды ствараўся ў свой час, як "заводская" каманда, з такой пастановай пытання не пагадзіліся і звярнуліся з адкрытым лістом да Аляксандра Лукашэнкі. Называючы ў сваім пасланні Лукашэнку чалавекам, "які шмат зрабіў для беларускага хакея", яны прасілі ўратаваць "Керамін" ад расфарміравання. Аляксандр Рыгоравіч ліст, можа, і прачытаў, але просьбу балельшчыкаў не задаволіў. Падобна на тое, што лёс хакейнага "Кераміна" быў перадвызначаны, і Аляксандр Рыгоравіч пра гэта ўжо ведаў...

Такім чынам, хакейны клуб "Керамін" спыніў сваё існаванне.

Вось як пракаментаваў сітуацыю старшыня Беларускай федэрацыі хакея Яўген Ворсін:

"Керамін" мае багатыя традыцыі — каманда заваёўвала Кубак Беларусі, была чэмпіёнам краіны ў 2002-м і 2008 годзе. Аднак у апошнія гады праца "Кераміна"сутыкнулася з цяжкасцямі, пачынаючы ад фарміравання фарм-клуба, наяўнасць якога была абавязковай для ўдзельнікаў чэмпіянату краіны. "Дубль" складалі хлопцы з СДЮШАР па хакеі, з якой у каманды была заключана дамова. У "Кераміна" не было ўласнай лядовай пляцоўкі — яны арандавалі Лядовы палац, а там толькі 4 раздзявальні, што недастаткова для знаходжання ў палацы большай колькасці каманд, чым адна.

Тым часам былі створаны дзве каманды — "Юнацтва" і "Мінскія зубры", якія выступяць у Маладзёжнай хакейнай лізе (*вырашана, што "Юнацтва" будзе гуляць якраз у Лядовым палацы на Прытыцкага, дзе з дзесятак гадоў гаспадарыў "Керамін"*. — **Аўт.**) і з'явілася неабходнасць для ўмацавання гэтых структур.

Таксама было прынята рашэнне разгледзець магчымасць умацавання за кошт рэсурсаў клуба "Керамін", і перш за ўсё маладзёжнага складу, каманд МХЛ".

Дарэчы, фінансавыя рэсурсы прадпрыемства "Керамін" зараз будуць накіраваны ў дапамогу ХК "Дынама-Мінск". Вынікам рэфармавання стане аб'яднанне ХК "Керамін" з "Мінскімі зубрамі".

Што тычыцца хакеістаў, з якімі неіснуючы ўжо "Керамін" раней заключыў кантракты, то яны вымушаны тэрмінова працаўладкавацца. У мінулую пятніцу было вядома, што новае месца працы знайшлі 11 хакеістаў. Яшчэ каля двух дзесяткаў спартсменаў у пошуках...

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Родные стены помогли?

Национальная сборная Беларуси вошла в восьмерку лидеров молодежного чемпионата мира по академической гребле.

В копилке белорусов золото и серебро.

ШАШКІ

Фестываль на фестывалі

Ён быў 5-м міжнародным па рускіх шашках і ладзіўся ў рамках фестывалю "Славянскі базар". У ім перамаглі міжнародны майстар Яўген Кандрачэнка (Гомель), нацыянальныя майстры Алег Холін (г. Жукоўка Бранскай вобласці) і Якаў Палікоўскі з Віцебска (галоўны турнір), Я. Кандрачэнка, кандыдат у майстры спорту з Маладзечна Аляксандр Барташ і майстар Андрэй Гайдукоў з расійскага г. Ціхвін (бліцтурнір). Двойчы чэмпіён Беларусі Я. Кандрачэнка перадаў на электронны адрас вядучага рубрыкі для нашага **бліца-70/6** фрагмент партыі, дзе чорныя нанеслі белым тактычны ўдар:



Белыя (Г.Барысаў): a5, c3, d2, e3, h2, h4 (6). **Чорныя** (Я.Кандрачэнка): c5, c7, d6, e5, f6, g5 (6). Першы ход чорных.

Спаборніцтвы на 100-клетачных дошках

Яны прайшлі ў Празе і на курорце Салоу (Іспанія). У ободвух вікторыю святкаваў экс-мінчанін Аляксандр Балякін, які зараз выступае за Галандыю. Прадстаўнікі Беларусі занялі такія месцы: Андрэй Толчыкаў (Гомель) — чацвёртае ў турніры "Злата Прага", Анатоль Гантварг (Мінск) — трэцяе ў іспанскім.

Калектыўныя творы

Іх склалі А.Маісееў (ЗША), Э.Скляр (Ізраіль) і наш чытач з Наваполацка П.Шклудаў. Першы з іх прапануем развязаць у якасці **бліца-71/2**:

Белыя: 11,12, 22, 23, 28, 29, 32, 41, 47, 48, 50 (11). **Чорныя**: 6, 9, 10, 20, 21, 31, 34, 36, 39, 40, 44 (11). Выйгрыш.

Другі разгледзьце па-за конкурсам:

Белыя: 11, 12, 22, 23, 25, 28, 29, 32, 41, 47, 48, 50 (12). **Чорныя**: 6, 13, 14, 15, 21, 30, 31, 34, 36, 39, 40, 44 (12). Таксама перавага белых.

***

Чакаем адказы на працягу двух тыдняў па адрасе: **220030, Мінск, вул. Энгельса, 34а, рэдакцыя газеты "Народная Воля", рубрыка "Шашкі"**.

Самаправерка

Бліцы: **70/5** (М.Вяргейчык): g5, g3 (g5) e3 (h4) d4, f6 (e1A) c5 (d2) g7=. A(g1) g7 (a7) d4 (e5) f8 (ac5) g7= і **71/1** (Г.Андрэеў). Амаль усе ігракі зразумелі, што трэба памяняць колер шашак: 43-39, 47, 41, 10, 39, 44, 34, 34x.

Мікалай ГЛАДКІ.

Суддзяў стане больш

Два дадатковых арбітра за варотамі будуць працаваць на матчах футбольнай Лігі чэмпіёнаў цягам бліжэйшых двух гадоў.

Міжнародны савет футбольных асацыяцый (IFAB) на пасяджэнні тэхнічнага камітэта ва Уэльсе даў згоду на працяг эксперымента з прыцягненнем дадатковых арбітраў, які быў распачаты ў сезоне 2009/2010 на матчах Лігі Еўропы.

Без згоды IFAB, у які ўваходзяць футбольныя асацыяцыі Англіі, Шатландыі, Уэльса і Ірландыі, ФІФА не можа ўносіць змены ў правілы футбола.

У Лізе чэмпіёнаў новаўвядзенне будзе дзейнічаць цягам двух бліжэйшых сезонаў. Да пытання аб прыцягненні дадатковых арбітраў на пастаяннай аснове IFAB вернецца на 126-м штогадовым агульным сходзе ў 2012 годзе.

Падрыхтаваў Антон ВІТАЛЬЕЎ.

Адрас рэдакцыі: 220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а. Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871. Тэл./факс рэкламнага аддзела: (017) 3286904, 3286906 E-mail : nv@promedia.by http://www.nv-online.info

ISSN 2071-9647
9 772071 964000 10116

Падпісныя індэксы: 63222,632222

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф Паўлавіч СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродка масавай інфармацыі №947 ад 6 студзеня 2010 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў друкарні РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Падпісана ў друк 26.07.2010 у 18.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж 21160 экз. Заказ №3594.